подходы к пониманию прошлого, оставляя наследие, которое продолжает вызывать интерес у исследователей. Вопросы жизни и смерти, патриотизма, морали и искусства стали центральными темами философских размышлений того времени [5].

### Список использованных источников


1. Могилевский областной исполнительный комитет. Официальный портал. //Беларусь помнит. Мемориальный комплекс «Памяти сожженных деревень Могилевской области» в деревне Борки Кировского района. - URL : https://mogilev-region.gov.by/category/belarus-pomnit/memorialnyy-kompleks-pamyati-sozhzhennyh-dereven-mogilevskoy-oblasti-v (дата доступа: 25.03.2025).
2. Сеть библиотек кировского района. //Деревня Борки. Память о великой трагедии. – URL : https://lib-kirovsk.mogilev.by/деревня-борки-память-о-великой-трагед/ (дата доступа: 25.03.2025).
3. Тарасевич, А.А. Философия войны. — Минск: Наука и техника, 2005.
4. Философия мира и созидания [Электронный ресурс]: материалы Международных круглых столов: «Народное единство и историческая память» 17 сентября 2022 года. – URL : https://rep.bntu.by/handle/data/129491 (дата доступа: 25.03.2025).
5. Аверинцев, С.С. Память как категория философии. — Москва: Наука, 1990.


## Мой знакаміты зямляк – Герой вайны

***Фёдараў У.С., Дождзікава Р.Н.***

Найбольш знакамітым сярод маіх землякоў з’яўляецца Аляксандр Іванавіч Слабада. Нарадзіўся Аляксандр Іванавіч 27 жніўня 1920 года у вёсцы Дуброва Дрысенскага павета Асвейскай воласці Віцебскай губерні, цяпер гэта Дубровы – вёска ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці. У 1937 годзе пачаў працаваць трактарыстам у мясцовым калгасе.

У верасні 1940 года быў прызваны ў Чырвоную Армію. Службу праходзіў у Саратаве ў Прыволжскай ваеннай акрузе ў 27-м асобным разведбатальёне 53-й стралковай дывізіі. Перад самай вайной па трывозе ў спешным парадку іх частку перакінулі ў Беларусь [1].

Чырвонаармейцы пагрузіліся ў таварныя вагоны. У адкрытыя задвіжныя дзверы свяціла сонца. Ехалі з жартамі. Лічылася, што едуць на вучэнні... Але, як аказалася, на вайну [2]. Першы бой з фашыстамі дваццацігадовы хлопец прыняў 25 чэрвеня 1941 года на рацэ Друць, пад Бялынічамі. Потым – знакамітае Буйніцкае поле пад Магілёвам, дзе Аляксандр Слабада падбіў два танкі. «Жахі на Буйніцкім полі, якія апісаў у сваёй кнізе «Жывыя і мёртвыя» Канстанцін Сіманаў, – гэта толькі іх асобныя фрагменты.

Гэта была другая Брэсцкая крэпасць, бо і мы змагаліся ў акружэнні. Часам мільгала думка: любой цаной застацца жывым. Як мы выстаялі, аднаму Богу вядома. Пра ўзнагароды тады ніхто не думаў», – сказаў Аляксандр Іванавіч Слабада ў адным з інтэрв'ю.

Увосень 1941 года будучы ў разведцы ён злавіў нямецкага яфрэйтара, да гэтага ў баях знішчыў 10 фашыстаў і параніў 1 матацыкліста [3]. Сваю першую ўзнагароду, ордэн Чырвонага Сцяга, Слабада атрымаў у снежні 1941 года. Уручылі яе за адвагу, праяўленую ў баях на Буйніцкім полі. Пройдзе час, і ў адным з баёў гэты ордэн выратуе жыццё свайму гаспадару: затрымае кулю, якая цэлілася ў самае сэрца. У складзе 43-й арміі на пасадзе памочніка камандзіра ўзвода прымаў удзел у абарончых баях пад Вязьмай, Малаяраслаўцам і Падольскам, а затым у контрнаступленні пад Масквой.

У студзені 1942 года Аляксандра Слабаду ўзнагародзілі другім ордэнам Чырвонага Сцягу – за адвагу, праяўленую пры абароне Масквы. Тады Чырвоная Армія адкінула гітлераўцаў ад сталіцы СССР прыкладна на 300 кіламетраў [4]. У ліпені гэтага ж года Слабада атрымаў раненне ў правую нагу. Пачалася гангрэна. Лячыўся ў шпіталі № 7 у Маскве.

Хірург Бурдэнка, гледзячы на рану, не верыў, што нагу можна будзе захаваць, але ўсё ж пагадзіўся яе выратаваць. На шчасце, абышлося без ампутацыі. Калі прыгожы дваццацідвухгадовы юнак уваходзіў у вагон маскоўскага метро, пажылыя людзі ўставалі, прапаноўваючы яму месца. На гімнасцёрцы лейтэнанта зіхацелі два ордэны Чырвонага Сцяга.

Пасля лячэння ў Маскве ён быў накіраваны на Калінінскі фронт, дзе ваяваў на пасадзе камандзіра роты аўтаматчыкаў у 5-й гвардзейскай дывізіі. У пачатку снежня 1942 года быў накіраваны ў тыл праціўніка на Віцебшчыну, дзе стаў камандзірам атрада №3 партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола. Атрад дыслакаваўся ў вёсцы Стайкава і дзейнічаў у Суражскім і Гарадоцкім раёнах, здзяйсняючы дыверсіі на чыгунках і налёты на гарнізоны праціўніка [3]. У 1942 годзе фашысты расстралялі яго бацькоў за сувязь з партызанамі і спалілі яго родны дом. Пра гэта Аляксандр Іванавіч даведаўся толькі пасля заканчэння вайны.

Вясной 1943 года Слабада ў баі пад вёскай Курына на Заходняй Дзвіне атрымаў цяжкае раненне. І зноў у правую нагу [1]. Самалётам яго адправілі на Вялікую зямлю. Праз тры месяцы лячэння Аляксандра Іванавіча Слабаду прызналі інвалідам Вялікай Айчыннай вайны другой групы і лекары вынеслі канчатковы вердыкт: «Да службы не прыдатны». Пасля выпіскі Аляксандр Іванавіч пачаў прасіцца ў ваенкама зноў на фронт, але ён яго не пусціў [5]. Так Слабада трапіў на камсамольскую работу.

У 1944 годзе ён стаў сакратаром Гомельскага абкома камсамола. У 1946 годзе Аляксандр Іванавіч Слабада быў накіраваны на вучобу ў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ, дзе ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. Яна праходзіла навучанне на камсамольскім аддзяленні, а ён – на партыйным [5]. З Нінай Паўлоўскай у іх было шмат агульнага. Яна віцяблянка, партызанка, якая пусціла пад адхон не адзін варожы цягнік. На яе парадным кіцелі ззялі тры Ордэны Айчыннай вайны, баявыя медалі [3].

У студзені 1948 года Аляксандр Іванавіч і Ніна Вікенцьеўна пажаніліся і пражылі душа ў душу 60 гадоў. У іх нарадзілася двое дзяцей – сын Яўген і

дачка Таццяна. Пасля вучобы ў партыйнай школе Слабада Аляксандр Іванавіч працаваў сакратаром Бабруйскага абкома камсамола, старшынёй Слуцкага райвыканкама, першым сакратаром Любанскага райкома партыі.

У 1966 годзе за дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака, яек, воўны і іншай прадукцыі яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Серп і молат». З 1970 па 1985 год Аляксандр Іванавіч працаваў намеснікам старшыні Рэспубліканскага камітэта народнага кантролю БССР, а ў 1985 года быў прызначаны на пасаду старшыні Мінскага абласнога Савета ветэранаў.

Акрамя ордэна Леніна і двух ордэнаў Чырвонага Сцягу, быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны першай ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак пашаны», Айчыны трэцяй ступені, Пашаны, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» першай і другой ступені, «За абарону Масквы» і іншымі. Таксама ён чатыры разы быў адзначаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, двойчы – Падзякамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аляксандр Іванавіч Слабада з'яўляецца Ганаровым грамадзянінам горада Любань і Ганаровым грамадзянінам Мінскай вобласці. Таксама ён удзельнічаў у Парадзе Перамогі ў Маскве ў 1995, 2000 і 2005 годзе [3].

Пражываў у Мінску, актыўна ўдзельнічаў у ветэранскім руху. Памёр 14 лістапада 2022 года на 103 годзе жыцця. Жыццё Аляксандра Іванавіча – гэта прыклад беззаветнага служэння Радзіме. У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны ён са зброяй у руках мужна змагаўся з ненавісным ворагам. У мірнай стваральнай працы ён таксама без перабольшання здзейсніў подзвіг, за што і атрымаў вышэйшую ў краіне адзнаку.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. «От верной смерти меня спас орден» – Бои, сражения, подвиги – Партизаны Беларуси [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:

https://partizany.by/battles/ot-vernoy-smerti-menya-spas-orden/. – Дата доступу: 17.03.2025.

2. «Та земля, кажется, до сих пор у меня под ногтями». Ветеран – о сражении на Буйничском поле – Минск-новости [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://minsknews.by/ta-zemlya-kazhetsya-do-sih-por-u-menya-pod-nogtyami-veteran-o-srazhenii-na-bujnichskom-pole/. – Дата доступу: 17.03.2025.

3. Слобода Александр Иванович [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://nasledie-sluck.by/ru/people/Rukovoditeli/7003/. – Дата доступу: 17.03.2025.

4. Почетный гражданин минской области Александр Слобода принимал поздравления с зимними праздниками от профсоюза – Минское областное объединение профсоюзов [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://moop.1prof.by/news/pochetnyj-grazhdanin-minskoj-oblasti-aleksandr-sloboda-prinimal-pozdravleniya-s-zimnimi-prazdnikami-ot-profsoyuza/. – Дата доступу: 17.03.2025.

5. Ветеран Александр Слобода: в последних боях уже кричали "Даешь Берлин!" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ria.ru/20200509/1571158304.html. – Дата доступу: 17.03.2025.

## Роль экономического фактора в достижении Великой Победы и принцип исторической справедливости

***Беркова О.В., Мушинский Н.И.***

Принцип исторической справедливости приобретает важное значение накануне знаменательной даты 80-летия Великой Победы содружества советских народов, в том числе жителей Беларуси, в Великой Отечественной войне.

С точки зрения философско-теоретического анализа особый интерес представляет исследование роли экономического фактора в достижении решающего превосходства над военно-промышленным комплексом нацистской